После перерыва хозяева первыми вышли вперёд. С подачи углового Евгений Баль нанёс коварный удар с близкого расстояния — 2:1. Лидчане пытались выровнять игру, но во втором тайме хозяева были неудержимы. Выход один на один с вратарём Егора Чигиря закончился в пользу нападающего. Уверенная победа ДЮСШ №1.

Егор ЖИГАЛИК

РАЗОШЛИСЬ МИРОМ

ДЮСШ №1 — 95 (СЛОНИМ) — ФК «ЛИДА» — 95 — 1:1 (1:0)

2 сентября 2012 г. г. Слоним. Стадион ДЮСШ №1. 100 зрителей.

Судья — Евгений Коваль (Волковыск).

Голы: 1:0 — Довгяло, 17 (автогол); 1:1 — Шуневич, 57.

ДЮСШ №1 (4–4–2): Турук — Жилинский, Аксютик, Берг Влад (Лойко), Ковш — Сушко, Пузач, Левошик (Павлюченко), Подрецкий (Быцко), Берг Виктор (к), Зеленевский.

Во второй кряду игре старшие юноши не смогли одержать победу. Хотя она была так близка.

Весь матч прошёл под диктовку хозяев. А гости остро контратаковали. На 17-й минуте матча Андрей Сушко с правой бровки выполнил навес в штрафную — центральный защитник лидчан выпрыгнул выше всех и поразил собственные ворота. Темп игры после забитого мяча вырос вдвойне, но не всегда с ним могли совладать отдельные игроки.

Голевые моменты увеличить счёт до перерыва имели Антон Зеленевский, Александр Левошик, Виктор Берг, но всем им не хватало хладнокровия, а иногда и вратарь выручал команду.

Перерыв, казалось, пошёл на пользу больше слонимчанам, но их атаки хоть и имели логические завершения — удары в ворота, голкипер соперников повод для радости отбирал у хозяев.

Увлёкшись атакой, хозяева просмотрели нападающего гостей, и пришлось на ровном месте сфолить на подступах своей штрафной. Гости использовали свой шанс. А вот капитан хозяев Виктор Берг свой шанс не использовал. Вышедший на замену Игорь Павлюченко ворвался с мячом в штрафную гостей и был остановлен не по правилам защитниками соперника. Пенальти. Вот здесь и не попал в ворота с «точки» капитан.

Егор ЖИГАЛИК

АНОНС СПОРТИВНОЙ НЕДЕЛИ

8 сентября 2012 года. Чемпионат Беларуси по футболу. 2-я лига. 26-й тур. «Белтрансгаз» (Слоним) — «Барановичи». Стадион «Юность». Начало в 16.00.

Турнирная таблица после 25-го тура

№	команды	И	В	Н	П	Мячи	О
1	**Смолевичи–СТИ**	**24**	**16**	**7**	**1**	**72–17**	**55**
2	Белтрансгаз	24	15	5	4	65-24	50
3	Гомельжелдортранс	24	14	7	3	44-15	49
4	Ислочь	23	12	5	6	32-20	41
5	Минск-2	23	12	4	7	37-26	40
6	Звезда-БГУ	23	12	4	7	36-23	40
7	Коммунальник	23	10	6	7	42-35	36
8	Жлобин	24	11	2	11	36-36	35
9	Забудова	24	11	1	12	35-52	34
10	Днепр-2	23	10	3	10	35-32	33
11	**Неман**	**23**	**9**	**6**	**8**	**31–26**	**33**
12	Ливадия	24	9	3	12	36-39	30
13	Орша	23	8	5	10	25-40	29
14	Динамо-2	24	8	3	13	21-36	27
15	Белкард	24	7	6	11	32-34	27
16	Барановичи	24	7	4	13	19-33	25
17	Миоры	23	5	6	12	23-57	21
18	Осиповичи	24	3	6	15	24-56	15
19	Витебск-2	24	2	3	19	21-65	9

с 2 сентября объявляется набор в секцию каратэ
Лицей №1 (Красноармейская, 39)
вт, чт 18.30, вс 15.00

▸ 22-Й ЧЕМПИОНАТ БЕЛАРУСИ ПО ФУТБОЛУ. 2-Я ЛИГА. 25-Й ТУР

ПОБЕДИЛИ В ГОСТЯХ

«ЖЛОБИН» — «БЕЛТРАНСГАЗ» (СЛОНИМ) — 0:1 (0:1)

2 сентября 2012 г. г. Жлобин. Стадион «Локомотив». 200 зрителей.

Судья: Н. Пыреев (Минск).

Гол: 0:1 — Куликов, 26.

«Белтрансгаз» (4–1–4–1): Мялик — Снопко (к), Анцыпов, Добриян, Голубев — Кудаш — Харитонович (Кевра, 78), Чудновский (Жегало, 77), Куликов, Хмелюк (Кудей, 70) — Кислюк (Косинец, 57).

Главный тренер — Алексей Шубенок.



ФОТО ИЗ АРХИВА «ГС»

Футболисты продемонстрировали хороший футбол. В исполнении гостей — команды «Белтрансгаза» — он смотрелся куда зрелищнее.

Игра изобиловала хорошими атаками, мяч держался неплохо, комбинационные действия футболистов позволяли создавать остроту возле ворот.

Первыми имели шанс отличиться жлобинцы, но удар на себя приняла перекладина ворот. Слонимчане ответили острыми моментами. Открыть счёт в матче удалось Алексею Куликову, который взял инициативу на себя, пошёл в обыгрыш с двумя соперниками и точно послал мяч в угол ворот. Как оказалось, это был единственный мяч в игре.

После перерыва на поле доминировали гости, но их атакам не хватало обострения, а если и проходили удары в створ, на месте был голкипер. Запомнились удары в створ Дмитрия Харитоновича и Дмитрия Кевры, но счёт не изменился.

Футболисты в праздничный день — День работника газовой промышленности — преподнесли викторию своим поклонникам.

Егор ЖИГАЛИК

РЕЛИГИЯ

НАСТОЯЩАЯ ВЕРА ИСЦЕЛЯЕТ НЕ ТОЛЬКО ДУШУ, НО И ТЕЛО


Горят свечи в Сынковичском храме


Пили чай


Молились


Икона Божьей Матери "Всецарица" собрала прихожан


Крестный ход

31 августа в деревне Сынковичи Зельвенского района в храме Архистратига Михаила совершилась Божественная литургия в честь иконы Божьей Матери «Всецарица».

После службы прихожане церкви и паломники отправились крестным ходом к святому источнику, у которого совершился молебен. Там желающие смогли набрать святой воды и искупаться в купели.

На праздник прибыло множество христиан не только из Беларуси, но и России.

Как рассказывали прихожане храма, икона Божьей Матери «Всецарица» обладает чудотворной силой — она помогла многим исцелиться от различных физических недугов. Исцелившиеся в знак благодарности оставляют различные дорогие украшения, которые находятся под стеклом иконы.

Екатерина ЯНУШЕВИЧ
Фото автора

ВЫБАРЫ-2012

МЕСЦА АГІТАЦЫІ — НА ВЫГАНЕ ЗА КУСЦІКАМІ

Чарговая выбарчая кампанія ў парламент набірае абароты. Гэта кранае не толькі зацверджаных кандыдатаў у дэпутаты, але і службы, якія забяспечваюць правядзенне самой кампаніі.

На паседжанні Мастоўскага райвыканкама прынялі рашэнне наконт вызначэння месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў (сходаў не ў памяшканні, мітынгаў, пікетавання) згодна з апавяшчэннем. Гэтым рашэннем у самым горадзе адведзены чатыры месцы правядзення кандыдатамі сваёй агітацыйнай працы — запаснае футбольнае поле за спарткомплексам па вуліцы Савецкай, поле стадыёна па вуліцы Зялёнай і пустэча між вуліцамі Пясочнай і Заслонава. Апошняя знаходзіцца амаль у бязлюдным месцы горада. Дзве першыя — у месцах, далёкіх ад людскога натоўпу, дзе звычайна праводзяць час аматары спіртнога і гаспадары выгульваюць сабак. Чацвёртае месца больш прыдатнае для агітацыі — пляцоўка ля гарадскога рынку. Аднак рынак знаходзіцца на ўскрайку горада, і ў будні тут прадаўцоў больш за пакупнікоў, а ў выходныя пляцоўка запаўняецца аўтамабілямі поўнасцю.

І гэта не адзіныя хібы ў рашэнні райвыканкама. У левабярэжнай частцы горада, дзе пражывае чвэрць выбаршчыкаў, месца для агітацыі не знайшлося. Не адведзена яно і ў катэджным пасёлку ля Вялікіх Сцяпанішак.


Мастоўскі райвыканкам

Нешта падобнае можна назіраць і ў сельсаветах. Прыкладам, у Правамастоўскім. Тут кандыдатаў хутчэй за выбаршчыкаў будуць слухаць каровы і школьнікі, бо райвыканкамам для агітацыі адведзена спартыўнае поле мясцовай школы, размешчанай на ўскрайку вёскі побач з фермай. Правамастоўцам, каб трапіць на сход, давядзецца ісці два кіламетры з другога канца вёскі, з Мастоў Левых — яшчэ болей. Па ўсім бачна, што ні адзін з кандыдатаў не стане ладзіць тут пікетавання і сходы не дадуць ніякіх вынікаў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

КУЛЬТУРА

"СЛЯДЫ АПОСТАЛАЎ" ПРЫВЯДУЦЬ У ГРОДНА


Кадр з фільма

Гродна стане здымачнай пляцоўкай для прыгодніцкага фільма.

Рэжысёра карціны "Сляды апосталаў" прывабілі гістарычныя будынкі ў цэнтры, якія нагадваюць забудову нямецкага горада сярэдзіны 20-га стагоддзя.

Таму менавіта ў Гродне вырашана здымаць сцэны, дзеянні якіх павінны адбывацца ў Берліне.

Здымачная група "Беларусьфільма" пачне працаваць ў горадзе з 17 верасня.

Дзеянні стужкі разгортваюцца вакол пошуку сямейнай рэліквіі магнацкага роду Радзівілаў — залатых фігур апосталаў, зробленых у чалавечы рост (іх лёс да гэтай пары застаецца невядомым).

Здымкі карціны праходзяць у Нясвіжы, Гродне, Мінску і Бабруйску.

Верхні горад у Мінску выкарыстоўваўся як дэкарацыі для здымак беларускага мястэчка часоў фашысцкай акупацыі (на здымку).

Чатырохсерыйны фільм павінен быць скончаны да канца кастрычніка.

"Твой Стыль"
Здымак belapan.com

ЭКОНОМИКА

ЛИМИТ НА ЭЛЕКТРОЭНЕРГИЮ УСТАНОВЯТ НА ГРАНИ ВЫЖИВАНИЯ

Уже подготовлен проект постановления правительства о введении для населения дифференцированной оплаты электроэнергии, о чем сообщил во время онлайн-конференции на сайте БелТА заместитель министра энергетики Беларуси Михаил Михадюк.

«Подготовлен проект постановления правительства, которым предусмотрено, что в зависимости от количества зарегистрированных жителей будет вводиться льготный объем потребления электроэнергии. При этом будет учитываться зимний и межотопительный период, наличие в доме газовой или электрической плиты. По льготной цене 4 человека должны использовать около 180 кВт·ч летом и 195 кВт·ч — зимой. Это касается квартир с электроплитой. Для газовых, конечно, меньше», — сказал замминистра.

Он отметил, что сегодня при себестоимости производства электроэнергии 9,75 цента за кВт·ч население платит около 3,5 цента. «Во всем мире за электроэнергию платят столько, сколько она стоит. Конечно же, у нас экономическая ситуация и уровень доходов населения этого не позволяют, но стратегически уровень перекрестного субсидирования с учетом реальных доходов населения должен сокращаться, поскольку сегодня то, что дешево, имеет такое же к себе отношение», — считает Михаил Михадюк.

Таким образом, хоть чиновник и не уточнил, но можно предположить, что семья из четырех человек в квартире с газовой плитой по так называемому социальному тарифу будет оплачивать чуть более 100 кВт·ч. Напомним, первоначально, когда еще только заговорили о введении разных тарифов на электроэнергию, предлагалось ввести так называемый социальный тариф — 150 кВт·ч энергии на одно домашнее хозяйство при наличии газовой плиты и 250 кВт·ч — при наличии электрической.

БелТА

НАВІНЫ

ПРАВЯЛІ ДЗЕНЬ ГОРАДА

Такой спешнай падрыхтоўкі да чарговай паказухі не назіралася на Мастоўшчыне ніколі. 16 жніўня на паседжанні аргкамітэта па святкаванні дня горада (хто ствараў гэты аргкамітэт, хто яго сябры і чыя была на тое ініцыятыва — мастоўцы не ведаюць) вырашылі правесці мерапрыемства і прызначылі дату — 25 жніўня.

Кіраваў паседжаннем старшыня райвыканкама Аляксей Шафарэвіч. Спешнасць у гэтай справе невытлумачальная, бо тэрмін падрыхтоўкі абмяжоўваўся тыднем. Свята павінна было прайсці пад знакам 525-годдзя горада Масты. Аднак ні на паседжанні аргкамітэта, ні падчас святкавання нікім не было адзначана, што цяперашнія Масты паўсталі напрыканцы 20-х гадоў мінулага стагоддзя, калі браты Канапацкія на стыку Нёмана і Зяльвянкі на супрацьлеглым беразе ад мястэчка Зяльвяне збудавалі дыхтавую фабрыку. Яшчэ ў пасляваенны час рабочы пасёлак значыўся як Масты Фабрычныя. І горад паўстаў Мастамі з утварэннем раёна. Гэты юбілей па праву павінны адзначаць вёскі Масты Правыя і Левыя, бо тут была ў мінулыя часы стратэгічная пераправа на скрыжаванні шляхоў з Гродна ў Слонім ды з Вільні да Бярэсця. Мястэчка мела элементы Магдэбургскага права, але не ў поўным аб'ёме, што дазваляла мець свой герб.

Каб свята стала масавым і гараджане не з'ехалі на лецішчы ды ў грыбы, кіраўніцтва арганізацый, устаноў, прадпрыемстваў горада абавязалі па разнарадцы дэлегаваць на мерапрыемства вызначаную колькасць работнікаў. Апошнія загад выканалі як ёсць: былі прызначаны святкуючыя, складзены спісы прысутных і перад пачаткам праверана іх наяўнасць. Сельгаспрадпрыемствам раёна, фермерскім гаспадаркам, народным умельцам было наказана, якую прадукцыю яны падчас святкавання павінны прадставіць на продаж. Акрамя садавіны і гародніны ў тым спісе значылася збожжа і бульба. Як сказаў гараджанін Анатоль Юрэвіч: "Выбірай: бульбу купляй або парасят".

Агулам карпаратыўнасць абласной раённай наменклатуры спрацавала. Гандлёвыя рады мастоўцаў дапоўнілі гандлёвыя кропкі кааператараў з суседніх раёнаў.

У дзень горада да абеду ішоў дождж. У другой палове дня, калі ўсталявалася надвор'е, свята перамясцілася на пляцоўку ля стадыёна "Нёман". Там яно ўдалося: дзеці прагнулі трапіць на шматлікія атракцыёны, дарослыя спажывалі шашлыкі ды моцныя напоі большым коштам, чым у фірмовай краме "Родны кут", што побач, бо там забаранілі на гэты час продаж віна і гарэлкі. Тут парадак забяспечвалі "собраўцы" ды міліцыянты з суседніх раёнаў.

На думку кіраўніцтва раёна, свята ўдалося. Толькі кім на тым гульбішчы былі мастоўцы, сказаць цяжка.

НА ДАЖЫНКІ — У ГОРКІ

Па выніках сёлетняга жніва сельгасгаспадарка раёна "Мастаўчанка" была прызнана першай у вобласці. Яе ўзначальвае Вячаслаў Семяновіч.

Працаўнікам гаспадаркі выпаў гонар прадстаўляць Мастоўшчыну на рэспубліканскім святе вяскоўцаў "Дажынкі-2012" у Горках Магілёўскай вобласці.

П'ЯНСТВУ — БОЙ! А З КІМ?

Пры УУС Гродзенскага аблвыканкама створана і працуе круглыя суткі гарачая лінія "П'янству — не".

Яе ініцыятары просяць у першую чаргу паведамляць пра факты незаконнага самагонаварэння, рэалізацыі і захоўвання алкагольнай прадукцыі насельніцтвам. Толькі ў той ідэі ёсць адна нестыкоўка: закону на легальны выраб самагону ў Беларусі не існуе.

ЖАНЭТ СЛУХАЛІ З ЗАДАВАЛЬНЕННЕМ ЗА ТАК

У суботу ў рамках абласной акцыі "За здаровы лад жыцця" на пляцоўцы каля раённага Дома культуры ў Мастах адбыўся бясплатны канцэрт беларускай спявачкі Жанэт.

Мець асалоду ад яе спеваў змаглі не толькі тыя, хто прыйшоў пабачыць і пачуць артыстку. Гукаўзмацняльная апаратура дазволіла зрабіць гэта за кіламетр і для тых, хто застаўся дома.

Язэп ПАЛУБЯТКА

СПОВЕДЗЬ

ГОРЫЧ КАЛІНЫ



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Быў апошні дзень жніўня. Так бы мовіць, ужо не лета, але яшчэ і не восень. Тыдзень таму назад я выйшла замуж, і мы з мужам знайшлі прыватную кватэру ў ціхім завулку, спрэс забудаваным драўлянымі дамамі. Дакладней, не кватэра гэта была, а невялікі пакойчык, затое ўтульны і светлы.

Замужжа, шчыра кажучы, мяне мала радавала, выйшла за Андрэя, каб не засмучаць маму, бо надта ж яна перажывала, што я пражыву век адна:

—Ні сястры, ні брата ў цябе няма, бацька памёр, а як мяне не стане, то зусім адна будзеш на белым свеце, — ледзь не плакала яна, угаворваючы мяне. — Паслухай добрае парады, выходзь за Андрэя Кавалёва. І працавіты, і гаспадарлівы, а што сірата, то хіба гэта ганьба? Як будзе лад ды згода, то і дабра нажывяце, і дом свой пабудуеце… Дваццаць сем гадоў табе, чаго чакаць? Між намі кажучы, добра яшчэ, што бярэ.

—Няхай сабе і не бярэ, ніхто яго не просіць!

Мама пачынала плакаць, і ад жалю да яе я была гатова ісці за таго Андрэя хоць сёння. Жыць у бацькоўскай хаце мы не сталі, бо я была супраць. Ведала, калі што не так, то мама абавязкова ўмяшаецца, а цешча і зяць рэдка калі ўжываюцца пад адным дахам. Лепш далей няхай жывуць, раднейшымі будуць.

У тую памятную жнівеньскую нядзелю да нашых гаспадароў прыехаў госць з Польшчы, малодшы сын гаспадынінай сястры, якая даўно жыла ў Варшаве.

—Ян нарадзіўся ў Польшчы, але добра ведае нашу мову, бо маці навучыла. Ён працуе інжынерам на заводзе. Трыццаць чатыры гады мае, але яшчэ нежанаты. Прыгожы, разумны хлопец, але адзін, не знайшоў, мабыць, дзяўчыну даспадобы, — казала цётка Ганна, калі прыйшла нас запрашаць за святочны стол. — Хадзем, дзеткі, пасядзім разам, весялей будзе.

За сталом мы з Янам сядзелі насупроць, побач са мной — муж Андрэй. З першай і да апошняй мінуты таго застолля я баялася падняць вочы, бо адчувала на сабе пільны погляд прыгожага чорнавалосага мужчыны. А зірнуць на яго цягнула магнітам. І калі нашы позіркі сустракаліся, ён усміхаўся сваёй адкрытай белазубай усмешкай, ад якой мне рабілася хораша і радасна.

"Распусніца, — дакарала я сябе ў думках. — Тыдзень, як замуж выйшла, а ўжо ледзь не млееш ад усмешкі старонняга мужчыны". А на змену гэтым папрокам прыходзіла горкае раскаянне: і папёр жа чорт замуж за гэтага Андрэя! Хіба ён так глядзіць на цябе? А ты сама хіба палаеш ад яго погляду?

Я зразумела, што закахалася ў Яна. Ды толькі што з таго…

Калі мы выйшлі з-за стала, то адразу падаліся на вуліцу, бо стаяла цёплае сонечнае надвор'е. Муж пайшоў у магазін па цыгарэты, а мы з Янам селі на лаўку, што стаяла пад вялікім кустом каліны. Ягады былі такія чырвоныя, нібы гарэлі агнём. Здавалася, што неўзабаве яны падпаляць старую бярозу, што расла побач. Я сарвала ягадку і, укінуўшы ў рот, прамовіла:

—Горыч…

Не ведала тады, не здагадвалася, які вялікі сэнс у гэтым слове, якое сугучча з маім далейшым лёсам.

—Пані Вера, я вам напішу пісьмо. Можна? — спытаў Ян.

—Вы што, якое пісьмо?! Я ж замужам…

—Якая горыч… — сумна прамовіў ён.

Міналі дні, гады. У мяне падрасталі дачушкі-блізняты. Было шмат клопатаў і на працы — у бухгалтэрыі аўтабазы, і дома, але не было таго дня, каб я не ўспаміналя Яна. Тое пачуццё, што ўспыхнула ў апошні дзень лета, саграваля мне душу, прыдавала нейкі асаблівы сэнс майму зямному існаванню. Мы мелі свой дом, машыну, але жаночага шчасця ў мяне не было. З Андрэем мы жылі так, нібы сышліся па рашэнні суда і павінны цярпець адзін аднаго да скону дзён…

Ян таксама памятаў пра мяне. Ён так і не ажаніўся. У кожным пісьме ці тэлефонным званку да сваёй цёткі Ганны перадаваў мне прывітанне. І гэтыя прывітанні былі нібы праменьчык святла ў царстве шэрых аднастайных будняў.

У пачатку 90-х гадоў усе каму не лянота пачалі цягаць у Польшчу торбы з таварам. Мне асаблівай патрэбы ў гэтым не было, але ж разам з суседкамі паперлася туды і я. Раз з'ездзіла, другі, а на трэці… Суседкі неяк жвавей распрадалі свой тавар, а ў мяне справа не ішла. Яны паехалі дадому, а я вырашыла застацца яшчэ на адзін дзень. Пераначаваўшы ў добразычлівай і гасціннай пані Любы ў Беластоку, раніцой накіравалася на рынак. Выходзячы з торбамі з аўтобуса, аступілася, і моцны боль працяў праву нагу. Упала б, каб людзі не падтрымалі. Што рабіць? Чужы горад, нікога знаёмага нават і блізка няма. Я з адчаю папрасіла нейкага добрага пана, каб патэлефанаваў у наш гарадок да цёткі Ганны і расказаў пра тое, што са мной здарылася. Можа, яна патэлефануе Яну і ён прыедзе, дапаможа… Надзея на гэта была слабая, і ўсё ж…

Добрыя людзі прывезлі мяне на чыгуначны вакзал, і там я стала чакаць, так бы мовіць, з мора надвор'я. Церпячы боль, праседзела больш за дзве гадзіны, як раптам пачула зусім побач:

—Пані Вера?

Гэта быў ён, мой Ян! Я не магла вымавіць і слова, толькі нясцерпна душылі слёзы.

Ён узяў мяне на рукі і панёс да машыны, потым прынёс багаж. Спачатку мяне паклалі ў бальніцу, потым Ян прывёз дадому ў гарадок, дзе я пражыла ўсё жыццё і дзе ніколі не была па-сапраўднаму шчаслівай.

—Пераязджай да мяне, Вера, — папрасіў Ян. — Мы возьмем шлюб і будзем жыць так, як табе і не снілася.

—Позна…

Мы часта тэлефанавалі адзін аднаму, расказвалі пра сваё жыццё. Я дзялілася з ім і радасным, і сумным. Толькі яму магла адкрыць душу, толькі ад яго мела шчырую спагаду.

І раптам званкоў не стала. Недзе праз тыдзень, змучаная чаканнем, я проста з работы пайшла да цёткі Ганны і застала яе ў жалобе.

—Верачка, я ўжо хацела табе званіць. Ян памёр. Не хварэў зусім. Раптоўна…

Свет перавярнуўся ў маіх вачах, усё стала чорным, нейкім непатрэбным і чужым. Я ведаю, што да канца дзён мне наканавана толькі горыч. І ад яе ўжо нічым не пазбавіцца…

З пашанай,

Вера Антонаўна

Да друку падрыхтавала Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

АНАЛИТИКА

ЭКСПЕРТ: МИССИЯ «ПРОДВИНУТОГО СЛОЯ» — ПРОФЕССИОНАЛЬНО РАБОТАТЬ НА БУДУЩЕЕ БЕЛАРУСИ

Казенный пиаровский шум по поводу вхождения Беларуси в клуб космических держав (речь идет о банальном запуске спутника с помощью России) не может затмить для человека думающего очевидной вещи: страна в центре Европы словно вывалилась из времени.

Белорусская экономическая модель разит «совком». Политическая — так и вовсе напоминает местами средневековье. Образование в застое. Культурная надстройка официозна и архаична.

В принципе это чувствуют и понимают почти все. Но при этом сдвигов никаких, господствуют фатализм и безнадега. И даже маститые аналитики говорят об историческом тупике.



В тупике

ДИАЛОГ О МОДЕРНИЗАЦИИ: ИДЕЯ БЕЗ МОТОРА?

На этом фоне вновь что-то пытается предложить Брюссель, вынужденный так или иначе изображать работу с «последней диктатурой Европы».

Если рассуждать чисто теоретически, то зерна новой инициативы ЕС «Европейский диалог о модернизации с Беларусью» должны упасть на очень даже благодатную почву.

О модернизации (конечно, в авторитарной парадигме) периодически твердят власти. Экономику синеокой республики пытаются понудить к трансформации как МВФ, так и Москва. Кардинальных реформ жаждет — по крайне мере вербально — оппозиция.

Наконец, феноменален настрой традиционно консервативных широких масс: согласно июньскому опросу НИСЭПИ, 77,3% белорусов считают, что страна нуждается в переменах. Ну а уж что касается самого Брюсселя, то там в этой нужде никто не сомневается.

Однако такой контекст выглядит благодатным лишь с точки зрения марсианина, который ни бельмеса не смыслит в наших реалиях с двойным дном. На деле — «все не так, ребята»:

- власть горделиво отвергает брюссельскую инициативу (почему в наших кабинетах не проштампована?);
- в оппозиции и третьем секторе царят разлад и кризис идей;
- народ хотел бы дождаться сдвигов к лучшему, не выходя из кухни;
- ну а Европа просто чертовски устала от белорусской шарады и скорее делает вид, будто что-то делает.

ЗА ПЕРЕМЕНЫ РАТУЮТ НА КУХНЯХ

Те три четверти белорусов, что выступают за перемены в стране, отнюдь не одним миром мазаны, подчеркнул в интервью БелаПАН основатель НИСЭПИ, доктор социологии профессор Олег Манаев.

Среди этих людей (см. таблицу 1 в низу материала) есть и такие, кто отмечает улучшение своего материального положения, считает, что страна развивается в правильном направлении, кто доверяет президенту. Иначе говоря, отнюдь не все — этакие баррикадные бойцы, принципиальные противники Лукашенко. От четверти до трети в этой категории — «люди, которых жизнь, в общем-то, устраивает», отмечает Олег Манаев.

Второй момент: лишь небольшая часть белорусов готова к решительным действиям, чтобы отстаивать свое право на иную, лучшую жизнь. Так, в митингах, демонстрациях, пикетах готовы участвовать около 15%, в забастовках — 11,4%. Это, опять же, теоретически. На практике смельчаков еще меньше.

Гораздо выше (уже более 50%, да еще добавится большинство пока не определившихся) готовность участвовать в парламентских выборах. Но тут другая закавыка: а есть ли в стране выборы?

ВЯЛАЯ АЛЬТЕРНАТИВА

Кроме того, важен вопрос, с кем связывать перемены, отмечает профессор Манаев. Здесь у белорусов большие проблемы. По идее, популярную альтернативу должна воплощать собой оппозиция. «Но уже на протяжении многих лет с девиацией в 1-2% оппозиционным политическим партиям доверяют около 15%, не доверяют примерно 60%», — констатирует собеседник.

Он добавляет, что личные рейтинги оппозиционных лидеров еще ниже: у Владимира Некляева — чуть больше шести процентов, у Андрея Санникова — пять с хвостиком.

Можно долго говорить о причинах, но факт то, что «кристаллизаторы общественного недовольства у нас слабые». При том что сегодня «народ голову поднял и стал озираться». Однако он не видит выразительной, яркой политической альтернативы. Масса чувствует, что у оппозиции мало силы, ресурсов, в том числе личностных, считает социолог. Оппоненты режима не перестраивают мышление, многие их схемы, типа затеи с очередным бойкотом выборов, — это дежавю, очередная попытка наступить на старые грабли.

Но, конечно, самый суровый фактор, работающий против перемен, — то, что «за 18 лет система укрепилась, забронзовела, и люди это чувствуют», подчеркивает Олег Манаев. Респонденты отмечают, что президент Лукашенко все в большей степени опирается не на народ, не на специалистов, а на «государевых людей» — военных, МВД, КГБ, вертикаль и других чиновников (см. таблицу 2).

Белорусы четко (особенно после разгрома Площади-2010) осознают: любое выступление против системы «чревато конкретными неприятностями». Впрочем, в новейшей истории есть немало примеров, когда и в более жестких ситуациях люди шли на жертвы ради перемен. Видимо, белорусы в этом плане еще «не вполне дозрели», не настолько недовольны нынешней ситуацией, чтобы начали вырываться «спонтанные протуберанцы», полагает профессор Манаев.

ЗАКОЛДОВАННЫЙ КРУГ

Валерий Карбалевич, эксперт аналитического центра «Стратегия», в интервью БелаПАН также высказал мнение, что белорусская власть может реагировать уступками лишь на какие-то публичные выражения недовольства. Ропот на кухнях ей не страшен.

Далее, зачем режиму идти на преобразования, когда «российские блага льются полным потоком», риторически спрашивает аналитик. И, несмотря на противоречия (Лукашенко не хочет отдавать собственность), Путин вряд ли рискнет перекрывать краник, лишать белорусского партнера щедрых дотаций. Для российского президента слишком важен проект Евразийского союза, убежден Карбалевич.

Вдобавок Запад очевидно не готов всерьез бороться с Москвой за белорусский геополитический плацдарм. США далеко, к тому же расхлебывают кашу противостояния с исламизмом, Евросоюз сфокусировался на внутренних проблемах (еврозона валится) и опасностях для своего южного мягкого подбрюшья (Магриб, Сирия и т.д.).

Ольга Шумило-Тапиола, эксперт Института Карнеги, отмечает: «В восточном направлении — я имею в виду страны, которые находятся между Евросоюзом и Россией, — ЕС не видит себя активным игроком и не готов к жесткой конкуренции».

КАПЛЯ КАМЕНЬ ТОЧИТ

Очень хотелось бы закончить статью хоть каким-то проблеском надежды. Но натужный оптимизм вечных политических бодрячков — адептов простых схем тоже надоел. К тому же пессимист — это, как известно, хорошо информированный оптимист.

«Серьезных факторов для перемен в стране я не вижу, — заключает политолог Карбалевич. — Похоже, что сегодня мы наблюдаем в Беларуси ситуацию исторического тупика».

Олег Манаев, со своей стороны, резюмирует так: миссия «продвинутого слоя» — упорно делать свое дело и не врать: обществу, загранице, себе.

«Представители несогласных, гражданское общество — все они должны и дальше делать то, что делали. Независимая пресса — писать, аналитики — анализировать, правозащитники — защищать, бизнес-ассоциации — продвигать интересы бизнеса и так далее, — убежден собеседник. — Мы должны делать это профессионально, по международным стандартам. Независимо от конъюнктуры, от политических приливов и отливов, от Путина или Баррозу. Независимо от того, придут перемены завтра или через двадцать лет».

Короче, рецепт не сенсационный, но проверенный: капля камень точит.

Что же касается титульной оппозиции, то ей, по мнению маститого социолога, вредили и вредят искусственные схемы, мифы, которые в том числе транслируются на Запад и в какой-то степени дезориентируют тех, кто принимает решения по «белорусскому вопросу».

Народ «как некое коллективное десятимиллионное существо» чутко улавливает фальшь как со стороны режима, так и со стороны его политических оппонентов, отмечает собеседник БелаПАН.

БелаПАН

ОБЩЕСТВО

ПРЕКРАЩАЕТСЯ ВЫПУСК БАНКНОТ В 10 И 20 РУБЛЕЙ



ФОТО ЖАННЫ ПЛЕШКО

С 1 сентября прекращается выпуск банкнот номиналом 10 и 20 рублей.

В обращении банкноты остаются до 28 февраля 2013 года.

Об этом сообщает Управление информации и общественных связей Национального банка Республики Беларусь.

С 1 апреля 2014 года данные купюры считаются недействительными.

БП

Афиша

КИНОТЕАТР «МИР»

5 сентября
«Инопланетное вторжение. Битва за Лос-Анджелес», начало сеансов в 18.00 и 20.00
Видеосалон
«Доброе утро», начало в 15.00, 17.00 и 19.00

6 сентября
«Неудержимые-2», начало сеансов в 18.00 и 20.00
Видеосалон
«Доброе утро», начало в 15.00, 17.00 и 19.00

7 сентября
«Неудержимые-2», начало сеансов в 15.30 и 20.00
«Мстители», в формате 3D. Начало сеанса в 17.30
Видеосалон
«Большие «мамочки». Сын как отец», начало сеансов в 15.00, 17.00 и 19.00

8 сентября
Мультфильм «Кот в сапогах», в формате 3D. Начало в 14.00
«Неудержимые-2», начало сеанса в 16.00
Детская дискотека, начало в 18.00
Видеосалон
«Большие «мамочки». Сын как отец», начало сеансов в 15.00, 17.00 и 19.00

9 сентября
Мультфильм «Кот в сапогах», в формате 3D. Начало в 14.00
«Мстители», в формате 3D. Начало сеанса в 16.00
«Неудержимые-2», начало сеансов в 18.30 и 20.30

РДК

7 сентября — торжественное мероприятие, посвящённое 20-летию общественной организации «Белорусский союз офицеров», начало в 15.30

ПЯТЫЙ КИЛОМЕТР ПОДЪЕЗДА К СЛОНИМУ — АНОМАЛЬНО АВАРИЙНЫЙ

На дорогах Гродненщины сегодня насчитывается 12 мест, где с аномальной частотой случаются аварии с пострадавшими. И 5-й километр подъезда к Слониму от трассы Р99, согласно информации http://grodnonews.by, входит в перечень самых аварийных участков.

Именно на этом участке возле Слонима было совершено три наезда на пешеходов, где пострадали три человека.

Весь список аномально аварийных дорог на Гродненщине выглядит так:

1. **115-116 километры автодороги М11 граница Литовской Республики — Бенякони — Лида — Слоним — Бытень.**
Три ДТП — столкновения и опрокидывания. 6 человек ранены.
2. **200-202 километры трассы Р99 Барановичи — Волковыск — Пограничный — Гродно.**
Четыре ДТП — столкновения и опрокидывания. 2 человека погибли, 6 ранены.
3. **6-й километр подъезда к Лиде от трассы М6.**
Четыре ДТП с участием пешеходов, 1 человек погиб, еще трое ранены.
4. **5-й километр подъезда к Слониму от трассы Р99.**
Три наезда на пешеходов, где пострадали 3 человека.
5. **77-78 километры трассы Р11 Поречаны — Новогрудок — Несвиж.**
Пять ДТП — столкновения и опрокидывания. 6 пострадавших.
6. **209-210 километры трассы М6 Минск — Гродно.**
Три ДТП — столкновения и наезд на велосипедистов. 2 человека погибли, 3 ранены.
7. **214 километр трассы Р45 Полоцк — Глубокое — граница Литовской Республики.**
В результате двух наездов на пешеходов погибли 2 человека.
8. **12-13 километры местной дороги Волковыск — Плебановцы — Дубовцы.**
В результате четырех наездов на пешеходов и велосипедистов 1 человек погиб, еще 4 ранены.
9. **1-й километр местной дороги Волковыск — Плебановцы — Дубовцы.**
В трех столкновениях автомобилей пострадали 3 человека.
10. **25-27 километры дороги Гродно — Поречье.**
В результате трех опрокидываний пострадали 5 человек.
11. **8-10 километры автодороги Березовец — Луки — Долматовщина (Кореличский район).**
Три наезда на пешеходов и велосипедистов, 3 человека погибли.
12. **600-метровый участок на 22-м километре дороги Липнишки — Лида.**
В трех авариях пострадали 4 человека.

Жанна ПЛЕШКО

ИДЁТ ПОДПИСКА НА 2-Е ПОЛУГОДИЕ 2012 ГОДА

И ДЛЯ ЭТОГО ЕСТЬ ПЯТЬ ПРИЧИН

1. «Газета Слонимская» – это газета, которая на рынке СМИ существует уже 15 лет. Нам можно доверять.
2. Те, кто подписался с 1.07.2012 г. на три месяца, примут участие в розыгрыше удивительных сюрпризов.
3. Подписавшись на квартал, Вы получите право на размещение в газете бесплатного частного объявления.
4. Подписная цена на «Газету Слонимскую» приемлема для всех.
5. Подписываясь на «Газету Слонимскую», Вы поддерживаете демократию.

ПОДПИШИСЬ ПРЯМО СЕЙЧАС!

ПОДПИСНАЯ ЦЕНА НА 2–Е ПОЛУГОДИЕ 2012 ГОДА			
Наименование печатного издания	**На 1 месяц**	**на квартал**	**на полугодие**
"Газета Слонимская" + "Отдушина"	16 000 руб.	48 000 руб.	96 000 руб.

ВЫРЕЖИ КУПОН, ЗАПОЛНИ ИЗВЕЩЕНИЕ, ПЕРЕЧИСЛИ ДЕНЬГИ НА Р/С И ОТПРАВЬ ПО АДРЕСУ: 231799, Г. СЛОНИМ, УЛ. КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 41, ИЛИ ПОЗВОНИ ПО ТЕЛ. 5-09-31, 8-029-322-06-42 — И НАШ КУРЬЕР ПОДПИШЕТ ВАС НА ДОМУ ИЛИ В ОФИСЕ.

ИЗВЕЩЕНИЕ

УП "Газета Слонімская"
(получатель платежа)
ЦБУ 422 ф–л 402 ОАО "Беларусбанк" г. Слоним код 689
наименование банка
Счет получателя 3012217000023 Лицевой счёт
УНП 500478342
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Пеня
Всего

Вид платежа	Месяц подписки	Сумма
За подписку		

Кассир Плательщик

УП "Газета Слонімская"
(получатель платежа)
ЦБУ 422 ф–л 402 ОАО "Беларусбанк" г. Слоним код 689
наименование банка
Счет получателя 3012217000023 Лицевой счёт
УНП 500478342
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Пеня
Всего

Вид платежа	Месяц подписки	Сумма
За подписку		

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П. Плательщик

УП редакции газеты "Газета Слонимская", УНП500478342, рег. свид. №64, от 05.03.09, Мин. инф. РБ

ВЫЕЗДНАЯ ПОДПИСКА НА 4-Й КВАРТАЛ 2012 ГОДА

НА 07.09.2012 ПЯТНИЦА

10.00-11.30 ДЯТЛОВО
12.00-13.30 КОЗЛОВЩИНА
13.50-14.20 ПАВЛОВО
14.30-15.00 НОВОСЕЛКИ
15.10-15.30 ТАЛЬКОВЩИНА

НА 14.09.2012 ПЯТНИЦА

9.30 -10.00 ОЗГИНОВИЧИ
10.10-11.10 МЕЛЬКАНОВИЧИ
11.30-11.50 ОСТРОВО
12.10-12.40 МИЖЕВИЧИ
12.50-13.10 ПАСИНИЧИ
13.30-14.10 СЕЛЯВИЧИ
14.20-14.40 Б.КРАКОТКА
15.00-15.40 ОЗЕРНИЦА
16.00-16.20 ЕЛКА

НА 21.09.2012 ПЯТНИЦА

9.30 -10.10 ШИЛОВИЧИ
10.30-11.00 ЖИРОВИЧИ
11.20-11.30 ОКУНИНОВО
11.40-12.10 ПАРТИЗАНОВКА
12.30-13.10 НОВОДЕВЯТКОВИЧИ
13.30-14.00 СУРИНКА
14.20-14.50 ГЛОВСЕВИЧИ
15.10-15.30 ДЕРЕВЯНЧИЦЫ

НА 28.09.2012 ПЯТНИЦА

10.00-11.00 ЗЕЛЬВА
11.15-11.45 ДЕРЕЧИН
12.00-12.40 ГОЛЫНКА
13.00-13.40 КОСТРОВИЧИ
13.50.14.20 СЕНЬКОВЩИНА
14.30-15.00 ПОРЕЧЬЕ

Казка

ЦЕПЛЫНЯ СЭРЦА


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Было тое ці не было, але, як кажуць, жыла-была адна старая. Быў у яе невялікі дом на ўскрайку лесу, а перад домам — сад. Былі ў яе свае радасці, але хапала і гора. Была яна хворая, і ў яе вельмі балела галава. І таму яна і нікуды не хадзіла — старалася не трывожыць іншых сваімі стогнамі. Была ўвесь час дома, тупала па гаспадарцы, а ў працы і боль нібы суцішваўся.

Узімку яна прысаджвалася каля цёплай печы і штосьці-небудзь вязала. Увесну і ўлетку даглядала дрэвы ў садзе, а ўвосень, сабраўшы ўраджай, брала мятлу і падмятала двор, поўны жоўтага лісця.

Лісця ў бабуліным двары было шмат. Яно падала з фруктовых дрэў, і нямала яго прыносіў вецер з лесу.

І вось аднойчы бабуля бярэ мятлу і са стогнам пачынае месці. Раптам невядома адкуль прылятае маленькая кветачка і падае на чыста падмецены двор перад самай бабуляю. Тая зірнула на кветачку і адмяла яе разам з іншым смеццем. Мяце бабуля і бачыць — тая ж маленькая кветачка зноў падае ў чысты двор. На гэты раз яна падняла яе, разглядзела, нават панюхала.

Пялёсткі ў кветачкі дрыжалі. І ў той жа час ад яе патыхала вельмі прыемным водарам.

—Што з табою, маленькая, чаго ты дрыжыш? — прыгалубіла яе бабулька.

—Мне холадна, вельмі холадна, вецер прынёс мяне здалёку, і я зусім скалела, — адказала кветачка.

Старой стала вельмі шкада яе, і яна хуценька палажыла кветачку за пазуху. А калі яна толькі сабралася аднесці падмеценае лісце ў канец двара, каб спаліць яго, нехта як бы прагаварыў:

—Немач цяжкую лечыць драбязінка любая.

Бабуля ўважліва прыслухалася і здагадалася, што размаўляе тая маленькая кветачка. Яна хуценька дастала яе. Кветачка ўжо не дрыжала ды і колер свой змяніла — уся палала чырванню.

—Як хораша ты гаворыш. Хоць бы сказала мне, хто цябе так навучыў? — спытала бабуля.

—Хто ж мяне навучыць мог? Яго мне падказала цеплыня твайго сэрца, — адказала кветачка і працягнула: — Ты павер, што я кажу: гора і хваробы лечыць дабрыні драбязінка любая.

Паслухала-паслухала старая ды і падумала: "Ці не лякарства ад маёй хваробы падказвае гэтая цудоўная кветачка?" Тут жа паклала яе на лоб і прывязала яе касынкай. І ці паверыце — адразу адчула сябе лепш, а назаўтра боль зусім прайшоў. Бабуля загарнула кветачку ў шаўковую тканіну і схавала ў камод. Калі ў яе пачынала балець галава, яна вымала кветачку, прыкладала яе да галавы, і боль адразу праходзіў.

Прайшоў час. Бабуля паправілася. Яна нібы нанова нарадзілася і як птушка лятала па сваім двары.

Аднойчы старая praведала ўсіх, хто быў дарагі яе сэрцу. Аднак дахаты яна вярнулася засмучаная. Ды і як ёй было не сумаваць? Куды яна ні заходзіла, там было многа хворых. Доўга думала бабуля і нарэшце ўспомніла пра сваю кветачку. Але ж тая кветачка высахла і рассыпалася.

Калі наступіла восень і бабулін двор быў поўны лісця, яна рашыла адшукаць такую гаючую кветачку. Ходзіць цяпер бабулька і пад дрэвамі шукае цудоўную кветачку. І з такой увагай шукае, што абавязкова знойдзе, не можа не знайсці!

Надзея ЦІХАНЧУК

Навіны

УЗНАГАРОДЗІЛІ ЛЕПШЫХ ЧЫТАЧОЎ


За салодкім сталом

Працаўнікі Слонімскай гарадской бібліятэкі №2 падвялі вынікі конкурсу "Слова кніжцы беларускай". З гэтай нагоды яны запрасілі да сябе самых актыўных юных чытачоў, якія найчасцей наведваюць бібліятэку, і правялі віктарыну "Да нас сябры прыходзяць са старонак кніжных".

Удзельнікі мерапрыемства прадставілі дзённікі аб прачытаных кнігах, а таксама распавялі, пра што яны чыталі.

Арганізатары мерапрыемства падрыхтавалі невялікую праграму для дзяцей, падчас якой загадвалі беларускія загадкі, чыталі вершы, распавядалі пра кнігу, узгадвалі беларускіх пісьменнікаў.

Удзельнікі конкурсу Крысціна Лабар, Ганна Палуносік, Вікторыя Шундрык, Вікторыя Беркус, Анастасія Палуносік атрымалі падарункі.

Мерапрыемства скончылася чаяваннем з цукеркамі і пячэннем.

Таццяна ПЛАХЕТКА
Фота аўтара


Фотаальбом


ФОТА РАІСЫ ЦЯРЭШКА
Даша — бабуліна памочніца


Галаваломка

ДЗЕСЯЦЬ КРОПАК

Як размясціць дзесяць пунктаў на пяці роўных адрэзках, каб на кожным адрэзку ляжала па чатыры кропкі?



СКАНВОРД



ОТ ВЛАДИМИРА ВАШУТЫ


Слово-пароль



Старонку падрыхтавала Жанна ПЛЕШКО

Школьный юмор

ГОВОРЯТ УЧИТЕЛЯ

- пожалуйста, включите минуту молчания
- не следует делать удивленных движений руками
- ну ясно же написано русским по белому
- у тебя что, Петров, языка нет постучаться?
- один глаз смотрит в тетрадь, другая рука пишет
- пишем вслух
- каким у вас по счету будет шестой урок?

РЭДАКЦЫЯ

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Кацярына ЯНУШЭВІЧ
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Стыль–рэдактар
Жанна ПЛЕШКО

Галоўны бухгалтар
Ганна ВАРАНОВІЧ
Юлія ЛІБІК
Аддзел падпіскі і продажу
Анатоль ВАЛАДАШЧУК
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Уладзімір КАЧАРГА
Аляксей ЛІБІК

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: 8 (01562) 5-09-31,
Тэл. 4-79-34, 2-33-95.
МТС: 8-029-584-87-32
Velcom: 8-029-133-04-21
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім-9, а/с 32.
e-mail: gs@gs.by
gs@mail.grodno.by
© «Газета Слонімская» Спасылка на «ГС» абавязковая

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнік
Кацярына ГЕРАСІМЧЫК
8-(044) 715-90-03
(9.00-16.00)
т/факс: 8-(01562)-5-09-27
Ⓚ Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Косаўскі рынак, галоўны корпус, другі паверх, каб. №14
Працуем аўторак — нядзеля 9⁰⁰-16⁰⁰
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў адказваюць асабіста за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з пoглядам рэдакцыі. Рэдакцыя не вядзе перапіскі з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

УВАЖАЕМЫЕ ЧИТАТЕЛИ!
Телефон для справок 8-(01562)-5-09-27

Собственное производство
PLAFEN
ОКНА ДВЕРИ ПВХ
"Реалпласт"
Рассрочка, скидка пенсионерам, новосёлам, молодожёнам
г. Слоним, ул. Красноармейская, 73 Б, 2-й этаж.
тел.: 801562-5-09-80,
МТС 8029 8697991, 80336245343,
Velcom 80447628766
УНП 590721619

АлексМАН
ОКНА ДВЕРИ
межкомнатные двери ■ металлические двери
ЧПУП "Алексман" УНП 590930059, собственное производство

МОНБЛАН
Акция! пенсионерам, многодетным семьям — скидка 5%
ОКНА ПВХ ДВЕРИ
БАЛКОННЫЕ РАМЫ
МОСКИТНЫЕ СЕТКИ
КАЖДОМУ КЛИЕНТУ — ПОДАРОК
Рассрочка!
ЭлитПрофи
т/ф 8 (01562) 5-05-43
8 (029) 399-61-31
8 (029) 199-46-62
г. Слоним

Окна, двери ПВХ
Балконные рамы
от 3-х окон - отливы бесплатно
от 5-ти окон - работа -10%
демонтаж бесплатно
Цена. Качество. Ничего лишнего.
Vel. 8 (044) 5000-197, МТС 8 (033) 371-5000

УВЛЕЧЕНИЕ

СЛОНИМЧАНИН ЛОВИТ РЫБУ НА ТЕРПЕНИЕ

Днями корреспондент «ГС» встретила на озере в деревне Деревная, что на Слонимщине, пожилого мужчину, который рыбачил на четыре удочки.


70-летний Сергей Николаевич Лабор — житель Слонима, но на это озеро в последнее время приезжает часто. По словам пенсионера, рыбачит он уже сорок лет и зимой, и летом. Чаще всего с рыбалки возвращается с уловом. Совсем недавно на озере в Деревной поймал карпа весом 3,5 кг, а перед этим — трехкилограммового.

Как отметил Сергей Николаевич, в его копилке уловов много чего было. Когда-то ловил жереха по 7-8 кг, а ещё раньше, около тридцати лет назад, на Щаре вылавливал сомов по 8 кг. Когда-то с другом они вели подсчёт улову, так за четыре года на озере в Сеньковщине и Шишках поймали 59 карпов, и все большого веса — от 8 до 12 кг.

Сергей Николаевич в 2006 году стал инвалидом по зрению, но любимое занятие не бросил. На рыбалку едет даже с ночёвкой. На вопрос о том, на что лучше ловить, рыболов ответил: "На терпение".

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора


Сергей Лабор — рыбак с сорокалетним стажем


Сергей Лабор закинул сразу четыре удочки

ГРАМАДСТВА

143 ЖЫХАРЫ ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ СЁЛЕТА ПАМЕРЛІ АД АТРУЧВАННЯ АЛКАГОЛЕМ

Больш за 30% злачынстваў у рэгіёне ўчыняюцца грамадзянамі нападпітку.

Паводле звестак Упраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама, найбольш ад няякаснага алкаголю на Гарадзеншчыне пamiралі ў 2008 годзе — 378 чалавек. На наступны год ахвярамі сурагатаў сталі 309 жыхароў вобласці, у 2010 годзе — 278, летась — 267.

Піць менш не сталі, але перавагу сталі аддаваць алкаголю, набытаму ў крамах.

Разам з тым толькі сёлета супрацоўнікі міліцыі Гродзенскай вобласці канфіскавалі 11 100 літраў водкасці з утрыманнем спірту, 8 500 літраў самагону, каля 150 тон самагоннай брагі. На металалом перапрацаваныя 390 самагонных апаратаў.

Падчас рэйду 17 жніўня на міні-заводзе, які выраблялі самагон ў Бярозаўцы, знойдзена 1 430 літраў самагону і больш за 9 тон брагі — агульнабеларускі рэкорд.

«Твой стыль»

ПРОИСШЕСТВИЯ

ВНОВЬ ПОСТРАДАЛИ ПЕШЕХОДЫ

Утром 3 сентября на улице Первомайской в Слониме водитель автомобиля «Ауди» наехал на пешехода, который переходил нерегулируемую «зебру».

В результате пострадавший получил телесные повреждения. Причина данного ДТП выясняется.

Похожее происшествие было зафиксировано вечером 29 августа на улице Шоссейной, в районе магазина «Ландыш». Водитель автомобиля «Фольксваген-Пассат» наехал на пешехода, который передвигался по нерегулируемому пешеходному переходу.

Александр ВИКТОРОВ

Изготовим доставим установим железобетонные декоративные заборы колодезные кольца
www.zdava.vsebar.by
Тел.: 80296441468 (Velcom) 5241468 (МТС), 0163-41-14-68
ЧПУП «ЗдаВа» УНП290906463

ПОГОДА НА НЕДЕЛЮ

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук

ЗАСНАВАЛЬНІК Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі РБ. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Адрас рэдакцыі: г.Слонім, вул. Косаўскі тракт, д. 37, офіс 16
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (ільготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 4 верасня 2012 года 16:00.
Аб'ём — восем умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 5165